ДУК “ Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр
і сетка публічных бібліятэк”

2023

Студзень

# Бібліятэчны веснік















Інфармацыйны веснік

# Студзень

1



**3 студзеня** ў чытальнай зале **Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылася гадзіна размовы “Практическая генеалогия”** з членамі клуба аматараў праваслаўнай гісторыі “Светач”. На сустрэчу быў запрошаны краязнаўца-аматар Ігар Мікалаевіч Лагуноў, які падзяліўся парадамі як пачаць генеалагічныя пошукі, да якіх крыніц можна звярнуцца, як карыстацца архівамі і базамі даных. Таксама практычнымі парадамі падзяліліся Святлана Мазжарава – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, Вячаслаў Ільін – старшыня Гарадоцкай раённай арганізацыі “Беларускае таварыства інвалідаў”. Іерэй Уладзімір Дагодзька расказаў аб важнасці захавання сямейнай гісторыі ў выхаванні дзяцей. Прысутныя прымалі актыўны ўдзел у абмеркаванні тэмы.




**4 студзеня ў Прудніцкай сельскай бібліятэцы** прайшло першае паседжанне клуба “Женсовет” – **эксклюзіў-святкаванне “Нам года не беда”,** прымеркаванае да 85-летняга юбілея адной з самых актыўных ўдзельніц клуба Юдавай Т. Н. Госці мерапрыемства дарылі імянінніцы творчыя падарункі падрыхтаваныя загадзя: вершы, песні, прыпеўкі. А падарункам ад бібліятэкара стаў фотаальбом са здымкамі разнастайных паседжанняў клуба ў якіх юбілярша прымала ўдзел. Скончылася мерапрыемства чаяваннем.



**4 студзеня** маленькія чытачы сабраліся ў **Межанскай бібліятэцы-клубе** на **літаратурнае турнэ “Дети читают о зиме”.** Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з тэмай зімы ў літаратуры, музыцы, жывапісу. Затым усе ахвочыя прынялі ўдзел у паэтычным конкурсе юных чытальнікаў.

**6 студзеня** ў **Руднянскай бібліятэцы-клубе** для ўдзельнікаў клуба “Мои года – моё богатство” адбыліся **калядныя пасядзелкі “Настали святки – запевай колядки”.** Прысутныя пазнаёміліся з каляднымі традыцыямі, такімі як: што гатаваць на стол на “галодную” і на “багатую” каляду, як апранацца. Удзельнікі ўспомнілі калядныя вершы і песні.



**6 студзеня** ў **Даўгапольскай сельскай бібліятэцы**, у рамках міні-праекта “Каникулы в библиотеке”, бібліятэкар правяла **бібліятэчную віктарыну “Па старонках любімых кніг”.** Дзеці адгадвалі загадкі, успаміналі кнігі аб зіме, Новым годзе, снезе, навагодніх звычаях. Па апісанні адгадвалі герояў казак. Потым прыгадалі вершы і песні пра зіму. Да мерапрыемства была аформлена **кніжная выстава “Снежно-нежная сказка зимы”.** У завяршэнні кожны абраў сабе кнігу з зімовымі казкамі.

У **Пальмінскай сельскай бібліятэцы** 8 студзеня адбылася **конкурсна-гульнявая праграма “Забавы у новогодней ёлки”** для ўдзельнікаў клуба па інтарэсах “Любознайка”. Бібліятэкар расказала дзецям, што надыходзячы год – год Труса, таму першыя спаборніцтвы былі на веданне цікавых фактах аб іх у конкурсе “Правда-неправда”. Асабліва развесяліў прысутных конкурс у якім неабходна было адлюстраваць розныя эмоцыі: радасць, любоў, боль, злосць, крыўда і г. д. У наступных конкурсах “Самый ловкий”, “Слови снежок” і інш. удзельнікі прадэманстравалі свае кемлівасць і спрыт.





Удзельнікі клуба “Вировлянские экологи” сабраліся ў **Віраўлянскай сельскай бібліятэцы** на чарговае паседжанне – **эка-акцыю “Поможем птицам пережить зиму”**. Бібліятэкар расказала прысутным аб тым як цяжка зімуючым птушкам пераiжыць сцюжу, многія з іх гінуць не ад холаду, а ад голаду. Дзеці даведаліся з якіх матэрыялаў і як можна зрабіць кармушкі для птушак. Затым усе разам павешалі кармушку на вуліцы каля бібліятэцы і пакармілі птушак.






**8 студзеня** дзеці са школьнага лагера, які існаваў пры ДУА “Межанскі дзіцячы сад – сярэдняя школа імя А.Я. Казлова” былі запрошаны ў **Межанскую бібліятэку-клуб** на на **этнічную гадзіну “Шчодры вечар – народнае свята славян”.** Удзельнікі мерапрыемства даведаліся што на **13 студзеня** прыходзіцца народнае свята, якое мае адразу некалькі назваў: Шчодры вечар, Шчодрык, або Шчадрэц. Бібліятэкар расказала, што ў гэты дзень варажылі і дарослыя, і дзеці, а асабліва незамужнія дзяўчаты, якія хацелі даведацца, што іх чакае ў будучым годзе. Цікава было паслухаць прысутным урыўкі з кнігі У.М. Сысова “З крыніц спрадвечных”, з якіх яны даведаліся аб старажытных звычаях і абрадах святкавання гэтага дня.

**10 студзеня** для навучэнцаў 5 класа ДУА “Езярышчанская сярэдняя школа ім. П. Э. Анціпава” бібліятэкарамі **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэкі** была арганізавана **міні-гульня “Волшебство Рождества”.** На працягу мерапрыемства дзеці па чарзе выцягвалі заданні з чароўнага куфэрка і спрабавалі іх выканаць, а калі ў кагосьці нешта не атрымлівалася сябры прыходзілі ім на дапамогу.

**10 студзеня** споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння рускага пісьменніка Аляксея Мікалаевіча Таўстога. Гэтай даце прысвечаны кніжная выставы ў бібліятэках Гарадоцкай сеткі.




“Персона. Алексей Толстой”
Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка




“Русский характер”
Даўгапольская сельская бібліятэка



**11 студзеня** бібліятэкар **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** падчас **інфармацыйнай гадзіны “Школа ветлівых навук”** тлумачыла выхаванцам ДУА “Яслі-сад №2 г. Гарадка” аб тым што ж такое ветлівасць? Маленькія ўдзельнікі мерапрыемства разам з бібліятэкарам разважалі, што азначаюць паняцці “ветлівасць”, “дабрыня”, якія ветлівыя словы трэба ўжываць у пэўных сітуацыях, навошта людзі выкарыстоўваюць ветлівыя словы. З цікавасцю дзеці ўключыліся ў гульні “Ветліва – няветліва”, “Сяброўскі поціск рукі”, разгадвалі загадкі, абмяркоўвалі верш “Урок ветлівасці”. Напрыканцы ўсіх чакаў прыемны сюрпрыз – паказ лялечнага спектакля “Кот і ліса”. Усё мерапрыемства было накіравана на выхаванне ў дзяцей міласэрнасці, дабрыні, чуласці.

**12 студзеня** бібліятэкар **Віраўлянскай сельскай бібліятэкі** правяла з навучэнцамі ДУА “Віраўлянская пачатковая школа” **падарожжа па казках Шарля Перо** “**В гостях у сказки**” да 395-годдзя казачніка. Вядучая мерапрыемства рассказала маленькім чытачам біяграфію пісьменніка. А затым усе разам успомнілі любімыя казкі адказаўшы на пытання віктарыны.



Дзень летуценніка “Где живут мечты“
Бычыхінская сельская бібліятэка

У рамках работы Кафедры праваслаўнай літаратуры і раённага тыдня, прымеркаванага да свята Нараджэння Хрыстова, у **Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы** прайшоў шэраг мерапрыемстваў. Самай яркай падзеяй з якіх стаў традыцыйны **калядны фестываль “Свет Вифлеемской звезды”**, які прайшоў **13 студзеня** ў літаратурна-музычнай гасцінай. Свята благаславіў Благачынны Гарадоцкага раёна, настаяцель Храма Святой Жываначальнай Тройцы, іерэй Уладзімір Дагодзька. На пачатку мерапрыемства госці фестывалю паглядзелі відэафільм ”Рождество“. Упрыгожаннем свята стала выступленне дзіцячых вакальных груп устаноў культуры горада. Начальнік аддзела ЗАГС Гарадоцкага раёна павіншавала памятнымі падарункамі тых імянінніках, якія нарадзіліся 7 студзеня. Падчас фестывалю адбылося ўзнагароджанне пераможцаў конкурсаў на лепшы сямейны відэаролік “**Рождество в моей семье**” і дзіцячай творчасці “**Рождественские мотивы**”, якія былі аб'яўлены раней.











Яшчэ адным значным мерапрыемствам, якое прайшло ў рамках работы Кафедры праваслаўнай літаратуры пры **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы 10 студзеня**, сталі **раённыя адукацыйныя чытанні “Светлый праздник Рождества”**. Увазе прысутных былі прадстаўлены вынікі шматдзённай работы навучэнцаў устаноў адукацыі Гарадоцкага раёна па дзвюх прапанаваных тэмах: “**Рождество в моей семье**” **і “Православные храмы Городокской земли”.** Усім удзельнікам чытанняў напрыканцы мерапрыемства былі ўручаны памятныя падарункі ад Гарадоцкага Благачыння.

**Гадзіна паэзіі “Рождественская радость”,** прысвечаная творчасці паэтаў-землякоў, сабрала ў **чытальнай зале Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі** сапраўдных аматараў паэтычнага слова. Паэты-аматары горада Гарадка і раёна падзяліліся сваімі прыгожымі, праніклівымі радкамі, як пра светлае свята, так і пра тое, што блізка і дарага. Таксама вершы аб Ражстве гучалі і ў выкананні навучэнцы ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Гарадка ім. А.П.Сабалеўскага”. Сваёй паэзіяй і жыццёвымі ўспамінамі падзялілася член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы Наталля Саветная. Краязнаўца-аматар Ігар Лагуноў прэзентаваў кнігі архімандрыда Савы Мажукі – багаслова, педагога і рэлігійнага публіцыста.



У рамках мэтавай праграммы “Духовность. Нравственность. Личность” у **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** прайшло першае паседжанне клуба “Истоки” – **паэтычныя чытанні “В след за Рождественской звездой”.** Гаворка ішла аб праваслаўным Ражстве, аб тэме гэтага цудоўнага свята ў праваслаўнай паэзіі. Прысутныя чыталі ўслых спадабаўшыяся ім вершы з кніг прадстаўленных на **выставе “Светлый праздник Рождества”.**



12 студзеня ў **аддзеле дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы** для выхаванцаў сярэдняй групы ДУА “Яслі-сад №2 г. Гарадка” адбылася навагодняя **гульнявая праграма “Ох, гэты Стары Новы год!”.** Падчас мерапрыемства бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў праграмы са звычаямі і традыцыямі святкавання Старога Новага года і калядак. Дзеці даведаліся, што гэта быў важны час для ўсіх, асабліва для земляробаў. Свята было звязана з абрадам абсявання, які павінен быў заклікаць поспех, залагодзіць будучы ўраджай. У дамах шчодра раскідвалі збожжа, спявалі, танчылі, жадалі адзін аднаму багацця і поспехаў. Юныя госці бібліятэкі прынялі ўдзел у гульнях і конкурсах “Без чаго не бывае Новага года”, “Навагодняя шкатулка”, “Навагодні маскарад”, “Ведзьміна мяцёлка”, “Навагодні аўкцыён”, “Вуснамі немаўля”, “Дзве лепш, чым адна”. Самыя актыўныя ўдзельнікі падчас гульні “Забяры падарунак” атрымалі навагоднія сюрпрызы. Напрыканцы мерапрыемства дзеці з вялікім задавальненнем паглядзелі лялечны спектакль “Навагоднія прыгоды Калабка”.



**14 студзеня** ў **Руднянскай бібліятэкі-клубе** прайшоў **вечар адпачынку “Этот Старый Новый год”.** Госці даведаліся аб гісторыі ўзнікнавення традыцый святкавання гэтага дня, аб тым колькі разоў і калі святкуецца Новы год у розных краінах свету. Прысутныя гулялі ў вясёлыя гульні, даведаліся жартоўныя прадказанні для сябе на будучы год.

**14 студзеня** ў **Прудніцкай сельскай бібліятэцы** для маленькіх карыстальнікаў адбылася **гадзіна карысных парад “О привычках, полезных и вредных”.** У ходзе мерапрыемства дзеці актыўна разважалі аб тым, якія звычкі карысныя, а якія шкодныя. Бібліятэкар расказала прысутным як прывіваць у сябе карысныя звычкі і якім чынам пазбаўляцца ад дрэнных. Шмат увагі было нададзена такой карыснай звычцы, як чытанне. Напрыканцы мерапрыемства вядучая параіла ўдзельнікам літаратуру аб тым, як шкодныя звычкі шкодзілі героям кніг, а добрыя выратоўвалі.



У студзені ў рамках **дабрачыннай акцыі “От всей души”** бібліятэкары сельскіх бібліятэк арганізавалі сваіх маленькіх карыстальнікаў і разам з імі наведалі чытачоў “залатога ўзросту” на даму, правялі гутаркі, громкія чыткі, прынеслі ім новыя кнігі. Мэта акцыі: праява клопату і ўвагі аб старэйшым пакаленні, максімальнае ўцягванне школьнікаў аказання ім дапамогі і падтрымкі.

у Даўгапольскай сельскай бібліятэкі, бібліятэкар афарміла выставу-папярэджанне “Наш выбар без наркотыкаў”. На выстаўцы прадстаўлены буклеты, кнігі, выразкі ў якіх прадстаўлена інфармацыя аб першых прыкметах ужывання наркотыкаў, а таксама аб тым, як усцерагчы родных і блізкіх людзей ад наркатычнай залежнасці.



**13 студзеня** да 85-годдзя з дня ўтварэння Віцебскай вобласці ў **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** прайшоў **літаратурны альманах “Сінявокая Віцебшчына”,** у рамках якога для карыстальнікаў адбыўся тэматычны агляд літаратуры з фонду бібліятэкі і віктарына.

Да 85-годдзя з дня ўтварэння Віцебскай вобласці бібліятэкі Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк арганізавалі выставы, прысвечаныя гэтай даце, для захавання і папулярызацыі ведаў аб Віцебскім краі: **“85 лет Витебской области” (Городоцкая цэнтральная раённая бібліятэка), юбілейная выстава “Віцебшчына мая сінявокая” (Віраўлянская сельская бібліятэка), кніжна-тэматычная выстава “Славлю тебя, синеокая Витебщина” (Пальмінская сельская бібліятэка), выстава-інфармацыя “Моя область – моя гордость” (Езярышчанская сельская бібліятэка), кніжная выстава “Наша область: вехи истории” (Бычыхінская сельская бібліятэка), тэматычная выстава “Витебская область 85 лет” (Межанская бібліятэка-клуб), выстава-экспазіцыя “На дзвінскіх берагах” (Дубраўская сельская бібліятэка).**








Моя область – моя гордость
ВІЦЕБСК
ВИТЕБСКАЯ область
ВІЦЕБСК
Регион ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТЬ
ВРЕМЯ ДЕЙСТВИЙ И ПРЕОБРАЗОВАНИЙ
ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТЬ 85 ЛЕТ
РЕГИОНЫ БЕЛАРУСИ
Гарады і вёскі Беларусі
Витебская область

Любы край, мая Віцебшчына
РЕГИОНЫ БЕЛАРУСИ
Верхнее Поднепровье и Белоруссия
ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ
ВІЦЕБШЧЫНА
Музей-усадьба
Шагал і Віцебск
Шагал и Витебск
Chagall and Vitebsk
ПІСЬМЕННІКІ ВІЦЕБШЧЫНЫ
ДАВЕДНІК
ВІЦЕБСК

мая Віцебшчына
РЕГИОНЫ БЕЛАРУСИ
Гарады і вёскі Беларусі
ВИТЕБСКИЕ ВЕСТИ
ВОДНЫЕ РЕСУРСЫ
ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ
ВИТЕБЩИНА
ВІЦЕБСК
Шагал і Віцебск
2023/1/18 12:03

Напярэдадні вялікага свята Хрышчэння Гасподняга або Богаяўлення, для наведвальнікаў **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі,** бібліятэкар правяла **гадзіну духоўнасці “Вот пришло Крещение – праздник очищения”.** Прысутныя даведаліся пра хрышчэнне Ісуса Хрыста на рацэ Іардан, а таксама цікавыя факты аб таінстве хрышчэння. Успомнілі рытуал асвяшчэння вады. З гэтым святам звязана мноства звычаяў, традыцый і прымет. Да мерапрыемства была аформлена **выстава-агляд “Крещение – святое Богоявление”.**

З 7 па 14 студзеня **ў Кабішчанскай сельскай бібліятэцы** традыцыйна праходзіць тыдзень, прымеркавыны да народнага зімовага свята Каляды. Усе жадаючыя маглі не толькі атрымаць парады, як адзначыць свята, пазнаёміцца з літаратурай па гэтай тэме, але і стаць яго удзельнікам. **13 студзеня** разам з супрацоўнікамі ДУК **“**Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна” філіял Кабішчанскі сельскі клуб бібліятэкар арганізавала і прыняла ўдзел у **свяце Каляд “Святкі-калядкі”**. Прысутныя пераапрануліся ў калядоўшчыкаў і пайшлі святкаваць жыхароў вёскі. Гаспадары сустракалі ражаных і шчодра частавалі гасцей, якія спявалі абрадныя песні, віншавалі і жадалі шчасця і дабрабыту.

**18 студзеня** традыцыйна для жыхароў вёскі ў **Руднянскай бібліятэкі-клубе** прайшла **гадзіна праваслаўя “Крещение Господне”.** Бібліятэкар пазнаёміла з гісторыяй і традыцыямі святкавання Хрышчэння Гасподня. Потым айцец Мікалай настаяцель Езярышчанскага прыходу правёл абрад асвячэння вады. Святар распавёў прысутным аб значэнні Хрышчэнскай вады, як ёй карыстацца.

**14 студзеня** бібліятэкар Даўгапольскай сельскай бібліятэцы правяла для жыхароў вёскі **агляд адной кнігі Канстанцыі Буйло “Коціцца рэха”.** Прысутныя даведаліся біяграфію паэткі, пазнаёміліся з вершамі.



**У студзені бібліятэкі Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк** ужо традыцыйна прынялі ўдзел у **V Міжнароднай акцыі “Читаем Григорьева вместе”,** якую штогод арганізуе Бібліятэка-Цэнтр зносін і інфармацыі ім. І. Н. Грыгор'ева г. Пскова. У чытальнай зале Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі адбыўся **слайд-марафон «Игорь Григорьев–поэзия его судьба».**




У **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** быў арганізаваны паэтычны вернісаж **“Поэзия его судьба”, падчас якога** наведвальнікі праглядалі літаратуру, прадстаўленую на выставе, зачытвалі ўслых вершы.



**17 студзеня ў Дуброўскай сельскай бібліятэцы** прайшла літаратурная гадзіна пад назвай “**Певец русской земли**”. На мерапрыемстве размова ішла аб жыцці і творчасці І. Грыгор’ева, гучалі яго вершы.



**У Бычыхінскай сельскай** бібліятэцы для карыстальнікаў прайшлі **інфарм-хвілінкі “Поэзия его судьба”.** Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных са зборнікамі твораў Ігара Грыгор'ева, якія раскрываюць высокую маральную сутнасць пакалення савецкіх людзей, якое непасрэдна ўдзельнічала ў вызваленні Радзімы ад фашысцкіх захопнікаў, праявіўшы масавы гераізм і мужнасць, стойкасць і высакароднасць характару. Да гэтага пакалення належыць і сам паэт, удзельнік партызанскага руху на Пскоўшчыне.

**20 студзеня** бібліятэкар **Віраўлянскай сельскай бібліятэкі** запрасіла чытачоў на **дзень памяці І. Грыгор’ева “Литературное наследие поэта”**. Прысутныя знаёміліся з творчасцю паэта, чыталі вершы. Таксама, на афіцыйнай старонке бібліятэкі ў сацыяльнай сеткі “ВКонтакте”, было размешчана відэа з расказам пра тое, як жыццёвы шлях паэта адлюстраваўся ў яго паэзіі.

**18 і 24 студзеня** бібліятэкар **аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** запрасіла маленькіх выхаванцаў дзіцячых садкоў горада Гарадка **ў казачную вандроўку па творчасці М. Чарняўскага "Пісьменнік з краіны дзяцінства!".** Мерапрыемства праходзіла ў рамках праекта "Чытаем разам па-беларуску". У пачатку мерапрыемства бібліятэкар пазнаёміла маленькіх беларусаў з кніжнай выставай "Чароўны свет паэзіі", прысвечанай да васьмідзесяцігоддзя пісьменніка. Падчас казачнай вандроўкі прысутныя даведаліся аб жыцці і творчасці паэта, жанравай разнастайнасці яго твораў. Дзеці з задавальненнем слухалі вершы пісьменніка. Завяршальным акордам мерапрыемства стаў прагляд лялечнага спектакля.




**20 студзеня ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** для пажылых жыхароў вёскі прайшла **інфармацыйна-пазнавальная гадзіна "В библиотеку за правом".** Прысутным расказалі аб рабоце публічнага цэнтра прававой інфармацыі, які існуе пры бібліятэцы. Да мерапрыемства была падрыхтавана **кніжная выстава "Мы и закон".**



**21 студзеня** маленькія чытачы прыйшлі ў **Вархоўскую сельскую бібліятэку** на **пазнавальную гадзіну “День снеговика”.** Дзеці даведаліся, што ў снегавіка, таксама, ёсць сваё свята – Міжнародны дзень снегавіка. Бібліятэкар распавяла удзельнікам мерапрыемства адкуль з’явіўся снегавік, павер’я звязаныя з ім, прадставіла цікавыя кнігі ў якіх Снегавік з’яўляецца галоўным героям.



**22 студзеня** бібліятэкар **Пруднікскай сельскай бібліятэкі** запрасіла дзяцей вёскі здзейсніць **эка-паход “Лес зимой”.** На мерапрыемства сабраліся маленькія чытачы якія захапляюцца прыродай родных мясцін. Спачатку бібліятэкар параіла прысутным кнігі з фонду бібліятэкі, аўтары якіх даюць апісання зімняга лесу і зачытала найбольш прыгожыя моманты. Каб убачыць сваімі вачыма, як змяняецца лес зімой усе разам адправіліся ў сапраўдны паход. Натхніўшыся прыгажосцю зімовай прыроды, дзеці зрабілі шмат фатаграфій і вырашылі хадзіць у паход у розныя поры года, фатаграфаваць лес, а затым арганізаваць фотавыставу.

**25 студзеня** для навучэнцаў старэйшых класаў ДУА “Бычыхінская сярэдняя школа ім. І.М.Антонава” ў **Бычыхінскай сельскай бібліятэцы** адбылася **гутарка аб мастаке “Палитра художника – в зеркале эпохи”,** прысвечаная 195-годдзю з дня нараджэння І. І. Шышкіна, рускага мастака-пейзажыста. Бібліятэкары пазнаёмілі прысутных з жыццём і творчасцю жывапісца. Былі прадстаўлены кнігі з фонду бібліятэкі, прачытаўшы якія, ёсць магчымасць больш даведацца пра гэтага знакамітага ва ўсім свеце чалавека. Мерапрыемства суправаджалася слайд-прэзентацыяй.



**25 студзеня** да 85-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага для дарослых карыстальнікаў у **Вархоўскай сельскай бібліятэцы** прайшоў **агляд літаратуры “Эпизоды творческой судьбы”.** Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з кнігамі аб біяграфіі і творчым шляхе У. Высоцкага. Неабышлося мерапрыемства і без прачытання чытачамі ўслых любімых вершаў са зборнікаў прадстаўленых на выставе.

У **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** ў гэты дзень была афармлена **выстава “Короткое счастье на всю жизнь”,** прымеркаваная да юбілею гэтага неардынарнага чалавека.




**25 студзеня** ў Таццянін дзень ў **Межанскай сельскай бібліятэцы** для чытачоў быў падрыхтаваны **бібліятэчны мікс “Книжные Татьяны”** на якім былі прадстаўлены кнігі сучасных пісьменніц з прыгожым імем Таццяна.



**26 студзеня** ў чытальнай зале **Гарадоцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі** для навучэнцаў ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Гарадка ім. А.П.Сабалеўскага” прайшла **прававая гадзіна** “**Закон сохранения доброты**” Пачалася гутарка з прагляду ўрыўка з кінафільма “Чучело” паводле аповесці В. Жалезнікава, у якім паказаны праблемы булінга сярод вучняў школы. Школьнікі пазнаёміліся з паняццем “булінг” і “кібербулін”, з мерамі папярэджання гэтай з'явы. У канцы сустрэчы ўдзельнікі дзяліліся адказамі на самае важнае пытанне: як змагацца з булінгам? Таксама прыйшлі да высновы, што тым, хто апынуўся ў такой сітуацыіяй не трэба змагацца ў адзіночку, а трэба абавязкова звярнуцца за дапамогай да настаўнікаў, ці бацькоў.




**27 студзеня** ў рамках міні-праэкта “Мир пернатых и зверей ждёт поддержки от людей” які распрацаваны ў **Дубраўскай сельскай бібліятэцы** прайшла **карысная размова “О тех кто лает и кусает”** для карыстальнікаў малодшага школьнага ўзросту. Дзеці гаварылі аб сваім чацвераногім сябры – сабаку. З радасцю дзяліліся сваімі назіраннямі за ім. Бібліятэкар расказала прысутным аб тым, што чалавек нясе адказнасць за братоў нашых меньшых. Хатнія гадаванцы не заўсёды могуць паклапаціцца пра сябе самі. Неабходна сачыць за іх здароўем, абавязкова рабіць прышчэпкі, а таксама надаваць ім увагу. Затым размова закранула праблему бяздомных сабак, прычыны іх з'яўлення на вуліцах. Прысутныя даведаліся, хто такія валанцёры, і як яны дапамагаюць бяздомным жывёлам. У канцы мерапрыемства вядучая нагадала аб тым, што трэба выконваць правіла бяспекі пры зносінах з жывёламі і прапанавала кнігі  з гісторыямі і казкамі галоўнымі героямі якіх сталі сабакі.

**27 студзеня** ў чытальнай зале **Гарадоцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі** для навучэнцаў старэйшых класаў установ адукацыі горада прайшла **гадзіна гісторыі “Многое забудется, такое – никогда!”** прымеркаваная да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакоста. Бібліятэкар расказала прысутным пра самую з'яву Халакост, пра канцлагеры і жорсткае знішчэнне яўрэйскага народа, пра гета на тэрыторыі Беларусі і Гарадоцкага раёна. Таксама аб тым, што ў Беларусі вядзецца работа па ўвекавечанні памяці гэтых жорсткіх падзей, школьнікам расказаў намеснік пракурора Гарадоцкага раёна Філіпенка Аляксандр Сяргеевіч. Напрыканцы прысутныя азнаёміліся з кніжнай выставай **“Память сердца”.** Мерапрыемства суправаджалася электроннай прэзентацыяй. У Вархоўскай сельскай бібліятэцы ў гэты дзень была аформлена **выстава-напамін “И ужаснулась земля …”** прысвечана да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту.



**28 студзеня** ў **Верамееўскай сельскай бібліятэцы** для чытачоў малодшага школьнага ўзросту прайшла **экалагічная гульня “Неизвестное об известных животных”.** Прысутныя даведаліся аб тым, што на нашай планеце існуе больш за два мільёны відаў жывёл і сярод іх ёсць шмат тых, якіх яны ніколі не бачылі. Таксама бібліятэкар расказала цікаваю інфармацыю, аб добра знаёмых жывёлах, якую дзеці не ведалі раней. Затым ўсе разам ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах.



**28 студзеня** ў удзельнікі бібліятэчнага клуба “Душевный разговор” з дапамогай бібліятэкараў, арганізавалі ў Бычыхінскай сельскай **бібліятэцы выставу творчых работ “Творения души и рук”,** на якой прадставілі сваі вырабы ў розных тэхніках рукадзелля, каб падзяліцца з карыстальнікамі бібліятэкі вынікамі захапленняў. Таксама аўтары работ расказалі прысутным сакрэты свайго майстэрства, парэкамендавалі кнігі і часопісы для тых, хто хоча заняцца вязаннем, вышыўкай, шыццём і інш.

Здаровы лад жыцця – адзін з прыярытэтных накірункаў дзейнасці бібліятэк сеткі. Бібліятэкары арганізуюць шмат мерапрыемстваў на гэту тэму для ўсіх катыгорый карыстальнікаў.



**5 студзеня** бібліятэкары Бычыхінскай сельскай бібліятэкі знаёмілі карыстальнікаў з кніжнай **выставай-заклік “Трезвая молодёжь – будущее страны”.** Бібліятэка павінна і можа стаць месцам для дыялогу, зносін з моладдзю. Асноўная мэта работы па прафілактыцы здаровага ладу жыцця – садзейнічаць стварэнню ў грамадстве “моды” на здароўе і адказнасці чалавека за свой жыццёвы стыль, развіццё сярод моладзі сістэмы прафілактыкі, якая дазваляе пазбегнуць фарміравання ў моладзі рознага роду залежнасцей.

**5 студзеня** для чытачоў падрастковага ўзросту бібліятэкар **Даўгапольскай сельскай бібліятэкі** аформіла **выставу-папярэджанне “Наш выбор без наркотиков”.** На выстаўцы прадстаўлены кнігі, буклеты, артыкулы з газет з інфармацыяй аб першых прыкметах ужывання наркотыкаў у падлеткаў, а таксама аб тым, як усцерагчы сваіх сяброў ад наркатычнай залежнасці.



**29 студзеня** ў **Пальмінскай сельскай бібліятэцы для** удзельнікаў клуба “Душевный разговор” прайшла **гадзіна карысных парад “Азбука здоровья”.** Гаворка ішла аб тым, што з ўзростам людзі губляюць фізічную актыўнасць, меньш звяртаюць увагу на лішнюю вагу. Аднак у любым узросце неабходна сачыць за тым, каб правільна харчавацца і заставацца актыўным – ад гэтага залежыць як доўга чалавек будзе заставацца здаровым. Бібліятэкар парэкамендавала прысутным кнігі па здаровым харчаванні, спартыўных практыкаваннях для любога ўзросту з фонду бібліятэкі.

**29 студзеня** у сценах **Езярышчанскай гарпасялковай бібліятэцы** быў праведзены **бібліякэшынг “Там на неведомых дорожках”.** На працягу гульні дзеці адправіліся ў займальнае падарожжа па бібліятэцы, дзе з імі адбыліся “сапраўдныя” прыгоды: яны разблытвалі галаваломкі, адгадвалі загадкі, як сапраўдныя дэтэктывы, спрабавалі знайсці падказкі для далейшага шляху. І вядома ў выніку адшукалі свой прыз.

У студзені ў бібліятэках сеткі былі аформлены выставы, прымеркаваныя да 90-годдзя вядомай беларускай мастачкі, ілюстратара дзіцячых кніг Алены Лось: выстава – экспазіцыя “Искуство мыслить образами” (Межанская сельская бібліятэка), кніжна – ілюстраваная выстава “Хто нашы кніжкі маляваў” (Езярышчанская гарпасялковая бібліятэка).

